Воспитательную работу в общежитии следует направить на создание педагогически воспитывающей среды, включающей наилучшие условия для самостоятельных занятий, пропаганду опыта лучших студентов, проживающих в общежитии, вовлечение их в научно-исследовательскую работу (олимпиады, конкурсы, лекции, диспуты, конференции).

Организация воспитательной работы в общежитии – прямое дело не только заместителя декана по воспитательной работе, воспитателя-методиста, студсовета, но и самих студентов.

УДК 378.1:37.018

## РОЛЯ НАЦЫЯНАЛЬНЫХ ТРАДЫЦЫЙ У ВЫХАВАННІ МОЛАДЗІ

*В. В. КУРБАТАВА*
*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт транспарту*

Найбольш актыўнай, прагрэсіўнай часткай чалавечага грамадства з’яўляецца моладзь. Студэнцкая моладзь – сацыяльна-дэмаграфічная група грамадства, якая займаецца падрыхтоўкай да прафесійнай дзейнасці пад час атрымання вышэйшай адукацыі. Засваенне перадавых ідэй, ведаў у працэсе адукацыі і выхавання дае магчымасць чалавеку абагульніць погляды на грамадства, вызначыць свае адносіны да Радзімы, людзей. На гэтай аснове адбываецца фарміраванне асобы. Дзякуючы вучэбна-выхаваўчаму працэсу студэнт набывае веды, вучыцца самастойна думаць, самаўдасканальваецца.

Беларусы за шматгадовую гісторыю стварылі багатую і самабытную культуру, якая ўвасоблена ў мастацтве, літаратуры і вуснай народнай творчасці. Зараз, калі ў якасці прыярытэтаў дзяржаўнага развіцця вызначана маладзёжная палітыка, рэалізацыя якой накіравана на ўсе групы моладзі, але ў большай ступені на студэнцтва, у пытаннях выхавання моладзі важна звяртацца да вывучэння нацыянальных традыцый і гісторыі свайго народа. Такі падыход у выхаваўчым працэсе дапаможа захаваць духоўную спадчыну сваіх продкаў, быць патрыётам роднай зямлі.

Для ажыццяўлення гэтага існуе цэлы арсенал сродкаў: арганізацыя літаратурна-музычных вечароў, сустрэч з пісьменнікамі і паэтамі, экскурсій, наведванне музееў. Літаратурна-музычныя вечары, як правіла, праводзяцца на базе літаратурна-музычнай гасцёўні, якая ставіць сваёй мэтай пазнаёміць студэнтаў з творчасцю беларускіх паэтаў. Прымаючы ўдзел у вечарах, студэнты апынаюцца ў свеце прыгожага з дапамогай слова, знаходзяцца пад уздзеяннем паэзіі, што выхоўвае пачуцці высакароднасці, любові, павагі за сваю нацыянальную літаратуру. Пажадана, каб тэматыка вечароў была разнастайнай і магла ахопліваць як творчасць аднаго паэта, так і многіх.

Сустрэчы з паэтамі, пісьменнікамі, тэатральнымі дзеячамі абуджаюць цікавасць да паэзіі сённяшніх дзён, вучаць успрымаць паэтычнае слова, вядуць да духоўнага самаўдасканалення.

Працэс выхавання немагчыма ўявіць без ведаў мінулага, традыцый беларускага народа, таму для засваення культурнай спадчыны мінулага неабходна арганізоўваць экскурсіі па гістарычных мясцінах краіны. Наведванне музееў, у якіх да нашых дзён захаваліся старадаўнія традыцыі і своеасаблівае мастацтва, пазнаёміць з культурай рэгіёнаў Беларусі. Многія музейныя калекцыі ствараюць своеасаблівае асяроддзе, неабходнае для ўспрымання культуры беларускага народа.

Неабходна, каб выхаваўчая работа, заснаваная на нацыянальных традыцыях, праводзілася сістэматычна, гэта будзе спрыяць фарміраванню асобы, у якой патрыятызм, нацыянальная самасвядомасць, пачуццё грамадзянскай адказнасці будуць прыярытэтнымі ў асобасным плане.

УДК 379.8.092

## РАЗВИТИЕ НАЦИОНАЛЬНОГО САМОСОЗНАНИЯ И ГРАЖДАНСКОЙ ПОЗИЦИИ В ДОСУГОВОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ СТУДЕНТОВ

*Л. А. КУРШАКОВА*
*Белорусский государственный университет транспорта*